

# ВАСІЛЬ ШАРАНГОВІЧ (1897—1938):

*«Я — здраднік Радзімы...»*

Яго біяграфія і лёс мала ў чым адрозніваюцца ад такіх жа біяграфій і лёсаў Людзей з вялікай літары таго часу — 20-х — 40-х гадоў мінулага стагоддзя. Такі ж імклівы ўзлёт і рост на тым ці іншым участку так зв. сацыялістычнага будаўніцтва, такая ж шчырая і праведная служба роднаму беларускаму народу... І, на вялікі жаль, такое ж трагічнае заканчэнне жыцця: беспадстаўнае абвінавачванне ў «нацдэмаўшчыне», «здрадзе» інтарэсам партыі, а ў канчатковым выніку — лагер, расстрэл...

І ўсё ж адзін радок у яго біяграфіі — адметны і непаўторны: Васіль Фаміч Шаранговіч стаў першым карэнным беларусам, які ўзначаліў партыйна-бальшавіцкую ўладу ў рэспубліцы амаль за 20-гадовы перыяд яе існавання!

Нарадзіўся Васіль Шаранговіч у вёсцы Качаны Вілейскага павета ў сялянскай сям'і. Нястача ў хаце прымусіла падлетка вельмі рана пачаць працоўнае жыццё: скончыўшы некалькі пачатковых класаў тамтэйшай школы ўжо ў 13-гадовым узросце ён пайшоў працаваць слесарам у чыгуначнае дэпо ў Маладзечне. Потым стаў памочнікам машыніста і, такім чынам, сем гадоў у прамым сэнсе слова працай загартоўваў свой характар.

Падзеі 1917-га 20-гадовы малады чалавек сустрэў прыхільна і з радасцю: пад уздзеяннем бальшавіцкай прапаганды Шаранговіч чакаў перамен у жыцці. Ужо ў снежні таго ж года ён звязаў свой лёс з РСДРП(б), а ў 1918-м быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

Падчас акупацыі Беларусі польскімі войскамі Цэнтральны камітэт КП (бальшавікоў) Літоўска-Беларускай рэспублікі на-

кіраваў Васіля на падпольную працу ў Мінскую губерню. Ён павінен быў перайсці лінію фронту і на акупіраванай тэрыторыі пачаць наладжванне партызанскай барацьбы з акупантамі. Пад падпольным прозвішчам «Лютовіч» Шаранговіч праводзіў сустрэчы і сходы з будучымі партызанамі, пад яго непасрэдным кіраўніцтвам былі нават праведзены некалькі баявых аперацый.

Аднак у пачатку мая 1920 года адзін з правакатараў выдаў польскай дэфензіве сапраўднае імя і прозвішча Васіля Шаранговіча і ён быў арыштаваны. Прысуд польскага надзвычайнага дарожнага суда быў жорсткі і катэгарычны: расстрэл. На шчасце маладога чалавека, неўзабаве справа была перагледжана і яго асудзілі на 20 гадоў катаргі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*